Жырандоля
*Выпуск № 35 (523)*

Вернісаж

# ЖЫЦЦЁ НАСУПЕРАК І ПРАЗ ПРЫЗМУ ВЕЧНАГА

**Міжнародны фестываль мастацтва «Арт-Мінск» стартаваў днямі ў сталіцы. Сёлета ўдзел у ім прымаюць творцы як з Беларусі, так і з Эстоніі і Славакіі. Убачыць маштабную экспазіцыю фэсту з работамі каля 400 беларускіх мастакоў можна на розных пляцоўках горада. Увазе наведвальнікаў таксама прадстаўлены работы І трыенале жывапісу, графікі і скульптуры Беларускага саюза мастакоў «VIVAT VITA», а таксама выставачны праект «Графіка года».**

— Сёння мы больш гаворым пра хваробы, пра тое, што адбываецца з людзьмі, але абмінаем увагай іншыя, не менш важныя, рэчы. Наш арт-фестываль — гэта вялікая падзея ў краіне, хоць у гэтым годзе яна і своеасаблівая. У адным фэсце аб'ядналіся тры вялікія праекты, якія наведвальнікі змогуць убачыць на працягу месяца да 16 снежня, — адзначыла **першы намеснік старшыні Беларускага саюза мастакоў Наталля ШАРАНГОВІЧ.** — Вядома, мы не змаглі б змясціць усе работы нашых мастакоў, якіх сёлета каля 400, таму пляцоўкі фестывалю з'явяцца не толькі ў Палацы мастацтваў, але і ў Нацыянальнай бібліятэцы, і ў галерэі «Мастацтва», у галерэі «Беларт» і іншых месцах. Напрыклад, у «Беларце» пакажам пейзаж у работах мастакоў розных пакаленняў, а ў галерэі «Мастацтва» ладзім выстаўку, прысвечаную творчасці Сяргея Цімохава, якому сёлета споўнілася б 60 гадоў... Таксама нам вельмі хочацца, каб не засталіся ўбаку мастацтвазнаўцы, бо важна не толькі паказаць мастацтва, але і гаварыць пра яго. Мяркую, пачынаючы з гэтага фестывалю заснуём традыцыю абмяркоўваць нашы мерапрыемствы і праекты. І спадзяюся, што дыскусія атрымаецца вострая, бо ёсць пра што спрачацца.

Так, у мастацкай галерэі твораў Леаніда Шчамялёва мінчане могуць пазнаёміцца з творчасцю Івана Міско, Васіля Шаранговіча, Льва Гумілеўскага, Уладзіміра Тоўсціка і самога Леаніда Шчамялёва. Выстаўка станковай скульптуры і малюнкаў Анатоля Арцімовіча «XXI стагоддзе» чакае сваіх наведвальнікаў у выставачнай зале імя Андрэя Бембеля. Экспазіцыя графікі Сяргея Цімохава «Край святла» адкрылася ў галерэі «Мастацтва». Праект «Сібірская гарачка» ад мастакоў са Славакіі чакае ў галерэі «Арт-Беларусь». У Нацыянальнай бібліятэцы Беларусі наведвальнікі змогуць пазнаёміцца з творчасцю эстонскіх мастакоў. А з 24 лістапада тут можна наведаць літаратурна-мастацкі праект «Княства вобразаў і сноў», прысвечаны 90-годдзю Уладзіміра Караткевіча. Гэты сумесны праект Нацыянальнай бібліятэкі і Саюза мастакоў Беларусі дае магчымасць як згадаць творчасць класіка, так і пазнаёміцца з работамі графікаў, што малявалі, натхняючыся творамі пісьменніка.


Фота БелТА.

«Тыя работы, якія з'ўляліся ў кнігах, павінны ўспрымацца не проста як ілюстрацыя, яны існуюць яшчэ і як самадастатковыя творы. Мы зрабілі своеасаблівы зрэз таго, як глядзелі на творы Караткевіча мастакі розных пакаленняў і светапогляду. На гэтай выстаўцы будуць унікальныя рэчы, напрыклад, малюнкі Арлена Кашкурэвіча, якія ён зрабіў яшчэ пры жыцці пісьменніка. Будуць работы Віктара Мікіты па матывах твораў класіка», — распавядае Наталля Шаранговіч.

Арганізатары адзначаюць, што імкнуліся кожны праект падрыхтаваць так, каб гэта было цікава аўдыторыі. З самага пачатку задумваліся і над арганізацыяй навучальных мерапрыемстваў. Зразумела, зараз складана сабраць людзей, але ўсё ж такі ў межах І трыенале распачнецца праект мастацтвазнаўца Таццяны Бембель. Яна прапанавала цыкл лекцый, прысвечаных найлепшым скульптарам, знакавым постацям XX стагоддзя. Першая лекцыя, якая распавядзе пра Міхаіла Керзіна, адбудзецца ў снежні ў Выставачнай зале імя Андрэя Бембеля. Гэта пачатак вялікай праграмы, якая расцягнецца на паўгода. Калі характарызаваць работы сёлетняга фестывалю з пазіцыі тэм і сэнсаў, варта адзначыць, што стала менш пейзажаў, а павялічылася колькасць тэматычных работ, дзе знаходзяць адлюстраванне ўзаемаадносіны паміж людзьмі, а таксама філасофска-сацыяльная праблематыка.

— Хачу спыніцца крыху на праекце І трыенале, які мы назвалі «VIVAT VITA», што ў перакладзе значыць «Вітанне жыццё». На сёння — гэта найбольш актуальны пасыл у няпростых умовах. Час выбраў нас, мастакоў, і мы адказваем на ягоны выклік. Творчасць і мастацтва зараз становяцца яшчэ больш актуальнымі і паказваюць, што жыццё ў любым выпадку пераможа любыя нязгоды, праблемы і перафармаціруе нас, дазволіўшы выйсці на новы ўзровень, — кажа **намеснік старшыні па творчых і агульных пытаннях Беларускага саюза мастакоў Андрэй БАСАЛЫГА.** — Другі праект «Графіка года» праходзіць у нас ужо чацвёрты раз. Прыемна, што мастакі эксперыментуюць, і да графікі, напрыклад, звярнуліся і жывапісцы, скульптары.

Варта адзначыць, што ў канцы фестывалю журы, у склад якога ўваходзяць мастацтвазнаўцы, вызначыць пераможцаў сярод удзельнікаў трыенале і праекта «Графіка года» ў такіх намінацыях, як «Жывапіс», «Графіка», «Скульптура», і асобна ў намінацыях «Графіка года» і Гран-пры. Убачыць творы і наведаць мерапрыемствы фестывалю можна кожны дзень да 16 снежня. Сачыце за раскладам у сацыяльных сетках фэсту.

**Алена ДРАПКО.**